УДК 821.161. 3.09

**Ніна Борсук (Брест)**

# МІФАЛАГІЧНЫЯ МАТЫВЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕРАСЦЕЙСКАЙ ПАЭЗІІ: ПЕРАЕМНАСЦЬ І ЎЗБАГАЧЭННЕ ТРАДЫЦЫЙ

*У статті порушено проблему поверненння сучасних митців слова до міфологічних традицій, спостережено їх спадковість. Стверджено думку, що не позбавлена національної самобутності й народної естетики поезія гідно поповнить скарбницю світової культури. Аналіз переконує, що сучасних творців цікавить не поганське світовідчутття, а багатоликість життя і світу, відображення архетипових образів у мистецтві.*

***Ключові слова:*** *міфологічні мотиви, сучасна поезія, традиція, філософізм, національна самобутність, естетична потреба, гармонія, архетип.*

Зацікаўленасць нацыянальнай міфалогіяй з боку беларускіх пісьменнікаў тлумачыцца павышанай увагаю творцаў да праблемы пераемнасці сучаснага літаратурнага працэсу з духоўнай культурай мінулага, эстэтычнымі запатрабаваннямі. Паэзія, якая не пазбаўлена нацыянальнай самабытнасці і народнай эстэтыкі, ніколі не будзе беззмястоўнай і з годнасцю папоўніць скарбніцу сусветнай культуры. Вышэйакрэсленай праблеме прысвечаны даследаванні В.Каваленкі [4], М. Грынчыка [2] і інш. Даследчыкамі [8, с. 88] вылучаюцца два віды літаратурнай міфалагізацыі. Сутнасць першага – у запазычванні міфалагічных вобразаў, матываў; другога – у стварэнні ўласна міфалагічнага літаратурнага вобраза па ўзоры з міфам старажытнасці.

На працягу мінулага стагоддзя беларускія пісьменнікі звярталіся да міфалагічных вобразаў, матываў, як да сродку ідэйна-мастацкага асэнсавання сучаснага жыцця, выяўлення агульначалавечых праблем і ўнутранай тэндэнцыі фарміравання рыс нацыянальнага характару. Зацікаўленасць да нацыянальнай міфалогіі ніколі не прападала, але часам паслаблялася з-за спрошчанага разумення ўзаемасувязей мінулага і сучаснага; руйнавання бальшавікамі духоўнай культуры; наступстваў тэхнакратычнай цывілізацыі. Нават у М.Танка мы сустракаем матыў непрыняцця міфалогіі: марнасць і бяссілле міфалагічных істот паэт супрацьпастаўляў высакароднай працы рабочых, земляробаў (верш „Табе“ ).

Бясспрэчна, зварот да міфалагічных традыцый быў уласцівы творчасці амаль усіх беларускіх пісьменнікаў, хоць, на наш погляд, выявіўся больш поўна ў творчасці Я. Купалы і М. Багдановіча. М. Багдановічу ў сваёй творчасці ўдалося ўзнавіць не толькі этнаграфічны воблік роднага краю, яго „адменную красу“ (паводле М. Багдановіча), але і далучыцца да вырашэння наспелай патрэбы ў „асвяжэнні душ“ (паводле А. Бабарэкі), у адраджэнні нацыянальнай свядомасці, гістарычнай памяці, у асэнсаванні эстэтычных катэгорый, маральна-этычных паняццяў.

Па назіраннях А. Лойкі, М. Багдановіч тонка адчуваў гісторыю ўзаемаадносін чалавека і прыроды і здолеў паказаць, як „спачатку прырода трымае чалавека ў сваім палоне, ён не разумее яе, абагатварае, адухатварае ў вобразах лесуноў, вадзянікоў, змяіных цароў і русалак...“ [6, с. 72]. Таму няма нічога дзіўнага, што нашы сучаснікі ў сваіх пошуках абапіраюцца на традыцыі беларускага класіка ў звароце да міфалагічных матываў. Сёння актуальна гучыць зварот М. Багдановіча з артыкула „Забыты шлях“ да паэтаў: „Наш сягонняшні, наш заўтрашні напрамак – да забытага намі народнага беларускага шляху“ [1, 2, с. 289].

Відавочна, яшчэ ў старажытныя часы чалавек пачаў акцэнтаваць увагу на культываванні гармоніі ва ўласным унутраным свеце і ў тым, яшчэ не названым, эстэтычным, пачуцці шукаць апірышча для свайго жыцця. У гэтым нам бачыцца адна з істотных прычын і заканамернасцей звароту як М.Багдановіча, так і сучасных паэтаў да міфалагічных матываў, да жадання і імкнення паглядзець на свет вачамі нашага далёкага продка.

Засяродзімся на мэтазгоднасці і асноўных аспектах функцыянавання міфалагічных матываў у сучасных паэтаў. Міфалагічныя матывы паглыбляюць роздум аб змястоўнасці і гарманічнасці жыцця продкаў („Вогнішча“ М.Рудкоўскага), дапамагаюць сённяшнім паэтам увасобіць адраджэнскія ідэі („Няспешны, хвалісты палёт“ М. Рудкоўскага, „Кава“, „Мара“ А. Дэбіша), перадаць боль, трывогу і заклапочанасць сучасным станам экалогіі, спусташэннем і выміраннем жывой прыроды („Сустрэча ў лесе“ М.Рудкоўскага), а разам з гэтым – і спусташэннем людскіх душ („Чарнабог“ А.Дэбіша, „Прыходзіў час“ М. Пракаповіча). Міфалогія дазваляе нашым сучаснікам выйсці ў свет асэнсавання эстэтычных, этычных катэгорый народа („Майму паляўнічаму“ З. Дудзюк, „Велямос“ А. Дэбіша).

У вершы „Вогнішча“ М. Рудкоўскі звяртаецца да вобраза бога Сварога. Праз узаемаразуменне, што наладзілася паміж лірычным героем

М.Рудкоўскага, „аматарам паходаў грыбных“, і богам Сусвету, паэт сцвярджае цесную сувязь чалавека з жывым светам прыроды, з народам, Радзімай. Гэта невыпадкова, бо з імем бога Рода (другое імя бога Сварога) звязана ў нашай мове мноства найважнейшых слоў і паняццяў: народ, радзіма, родзіч, продак, радавод, нараджэнне, прырода, ураджай, адраджэнне...

Матывам трывожнага чакання, прадчуваннем катастрофы прасякнуты і верш „Сустрэча ў лесе“ М. Рудкоўскага. Былога ахоўніка цішыні азёр і крыніц, валадара лесу ахоплівае сум. „Праганяюць лесуноў з лясоў, / З тоняў, з трыснягоў – вадзянікоў / і русалкам не даюць прапіскі / ў палавеі жыта за сялом“. Як крык аб паратунку гучаць праніклівыя словы паэта пра запусценне лясоў, трагічны, горкі лёс рэк: „І становіцца масівам бор, / вадаёмам – глыбіня азёр“. Праз перажыванні міфалагічных істот М. Рудкоўскі з трывогай нагадвае пра сучасны стан беларускай прыроды. Яго, як у свой час М. Багдановіча, непакояць адносіны чалавека да навакольнага свету.

М. Пракаповіч надзяляе міфалагічныя істоты не толькі душой, але і свядомасцю (паэма „Прыходзіў час...“). Назіраючы за людзьмі, якія выйшлі з „нематы“, але, на жаль, трапілі „ў бязвер’е“, ні заімшэлы вадзянік, ні меч-трава не спадзяюцца больш на літасцівую волю і розум чалавека. Міфалагічных герояў гэтага паэта ахоплівае нават спачуванне, калі яны бачаць, як людзі падобна кратам, „капаюць, капаюць сабе капцы,– / ні неба, ні сонца не бачаць, сляпцы!“. Барацьбу за чалавечыя душы распачынае вадзянік і меч-трава на старонках кнігі М. Пракаповіча „Мяжа надзеі“: „Я ў Чырвоную кнігу / занесці прашу / першай – / Чалавечую Душу“ (паэма „Прыходзіў час“). Так праз мастацкія вобразы міфалагічных істот сучасныя паэты заклікаюць ахоўваць неруш прыроды, засцерагаюць чалавека ад неразумных дзеянняў, а таксама пратэстуюць супраць спусташэння людскіх душ.

Асноўная ідэя верша М. Рудкоўскага „Няспешны, хвалісты палёт“ пераклікаецца з думкай У.Калесніка, што „смерць і ўваскрашэнне Беларусі – цэнтральны скразны матыў нацыянальнай міфалогіі. Ён пранізвае нашу літаратуру і зводзіць яе ў адзіны ланцуг народнага лёсу“ [5, с.285]. Думка даследчыка, у сваю чаргу, сугучная багдановічаўскай (вершы „Я спакойна драмлю пад гарой між кустоў“, „Пугач“). Лясун М. Багдановіча – сімвал магутных, але скаваных пакуль што бяздзейнасцю сіл беларускага народа (верш „Я спакойна драмлю пад гарой між кустоў“). Міфалагічная істота поўная сілы і энергіі. Яна не прадстае перад намі, як „нешта застыглае, у руху сваім – нерухомае“ [6, с. 173]. Тут мы не падзяляем меркаванне А. Лойкі. Лесуна стаміла лясная цішыня. Ён прагне дзеяння. Няхай нават у такой форме, як стыхійны пратэст. Пачуўшы ў цішы звон падковаў, лясун гатовы рынуцца ў смяротную схватку з невядомым коннікам: „Ці не гукнуць, каб рэха па лесе пайшло / Каб з касцямі, у кавалкі разбітымі, / Нехта біўся ў крыві, каб мне можна было / Усю ноч рагатаць пад ракітамі?!“.

Характэрна, што міфалагічны пугач у вершы „Няспешны, хвалісты палёт“ М. Рудкоўскага, як і ў М. Багдановіча, не выступае бездапаможнай істотай. Як і нашы продкі, сцвярджаў паэт-сучаснік, пакаленне новага тысячагоддзя адносіцца да іх з цікавасцю і нават павагай, бо менавіта „глухі, трагічны рогат“ пугача, што пракаціўся па лесе рэхам, прымушае задумацца падарожнага аб неабходнасці аплачваць грахі далёкай даўніны: „Колькі год / У цішы звонкай, нібы медзь, / Злым духам кружыць, і смуткуе“. Ці не аб тым гэты верш М.Рудкоўскага, што некалі мы выракліся матчынай мовы, і сёння ахвотней гаворым на мове суседзяў?.. А ці не знікнем заўтра і як насельніцтва?..

У вершы „Я спакойна драмлю пад гарой між кустоў“ выразна прасочваецца думка В. Каваленкі, што паэт свае назіранні, даследаванні праводзіў на мяжы, калі „прырода і чалавек былі ў дзіўным, няпэўным стане бадзёрасці і сну, быцця і небыцця“ [4, с. 223]. Менавіта ў такім стане „нараджаецца прадчуванне вечнага, неперахоДнага, якое не страчвае жывой сувязі з рэальным светам людскіх узаемаадносін“ [4, с. 223]. Выснову, да якой прыходзіць даследчык, можна па праву аднесці і да верша М. Рудкоўскага „Няспешны, хвалісты палёт“.

Міфалагічны вобраз русалкі ў вершы З. Дудзюк „Майму паляўнічаму“ падначалены маральна-выяўленчай функцыі, у той час як верш В. Дэбіша „Ява падання“ уяўляе сабой пераапрацоўку ў паэтычнай форме народнага падання. Яно ўведзена ў твор з мэтаю паглыбіць перажыванні лірычнага героя: „Сэрца заходзіцца болем... / Табой раскаханы, / Прочкі бягу я праз ноч, / праз крб.вавы світанак. / З гэтага горада, / змрочнага спрэс і пустога. / І неадступна за мною – русалкі рогат“. Па паданні, як вядома, русалка губіць хлопца проста так. Такое ў яе прыроднае прызначэнне і жаданне – знішчаць прадстаўнікоў мужчынскага роду.

Праз верш „Майму паляўнічаму“ З. Дудзюк праводзіць гуманістычную думку аб вялікай сіле прыгажосці і хараства. Яе лірычная гераіня не асуджае каханага за тое, што не здолеў су працьстаяць чарам красуні-русалкі. Болей таго, яна ганарыцца сваім абраннікам, які не пабаяўся прайсці міма русалкі, хаця і ведаў, што наўрад ці здолее ўхіліцца ад смерці ў палоне яе хараства. Гераіня гатова падзяліць з каханым яго трагічны лёс: „І дамоў не пусціць. / Я памру ў чаканні. / Не хадзіў бы ў пушчу / Без мяне, каханы“. І толькі

выхад у свет маральных каштоўнасцей народа дае сілы гераіні З. Дудзюк пераадолець уласны боль.

На наш погляд, зварот сучаснай паэтэсы да міфалагічных вобразаў невыпадковы. „Адменную красу, адменную рытміку, адменны чар“ беларускага краю, пра якія гаварыў М. Багдановіч, З. Дудзюк здолела заўважыць яшчэ ў дзяцінстве. Ніяк не магла яна звыкнуцца з украінскім стэпам, калі сям’я пераехала на Украіну і жыла каля Крывога Рога. „Мне здавалася, – успамінае З. Дудзюк, – што былінкі палыну ў зімовай шэрані – гэта лес, які зачаравалі, і ён змізарнеў, але захаваў рысы дрэў. Перш за ўсё соснаў. Сосны найбольш зберагліся ў памяці: калі мы пакідалі Беларусь, яны хапаліся рукамі-галінамі за барты грузавіка... Мне часта бачыліся і нашы міфалагічна-казачныя істоты, асабліва лесавік. А быў і такі выпадак. Гуляла за хутарам – а мы былі хутаранцамі, – як раптам падыходзяць два дзяды ў беларускай вопратцы і просяць напіцца вады. Пабегла, прынесла, а іх ужо няма, быццам расталі ў паветры. Што гэта было – уява, міраж ці сапраўднасць, не ведаю дасюль“ [3, с.5].

У шырокім дыяпазоне сучасных эстэтычных меркаванняў бытуе думка, што старажытнае светаўспрыманне, міфалогія не могуць спрыяць адраджэнню духоўнасці, што на гэта здольна паўплываць толькі хрысціянства. На наш погляд, гэтыя дзве веры гарманічна дапаўняюць адна другую. Падчас аналізу вершаў, у якіх асэнсоўваюцца праблемы чалавек – грамадства, асоба – гісторыя, пытанні духоўнага сталення асобы, мы мелі магчымасць пераканацца ў выказанай вышэй думцы.

Зварот да міфалагічных вобразаў, легенд звязаны з жаданнем сучасных паэтаў праз вядомае, больш зразумелае (з гэтым матэрыялам знаёмы многія з дзяцінства) прыцягнуць увагу да пастаўленых праблем. У выніку нараджаецца ланцужок – інтэрпрэтацыя рэчаіснасці, вобраз, сімвал. „Міфатворчасць з’явілася своеасаблівай сімвалічнай „моваю“, у тэрмінах якой чалавек мадэляваў, абагульняў з’явы свету. Міф – перш за ўсё абагульненне, але праз канкрэтнасць“ [9, с. 8].

Для паэта важна, каб закранутыя ім у паэтычным творы пытанні былі ўспрыняты чытачом у першую чаргу сэрцам, глыбей адчуты, а потым ужо асэнсаваны. Для вырашэння гэтай задачы, бясспрэчна, жыватворную глебу ўяўляе міфалогія, паколькі ў ёй пераважае эмацыянальна-асацыятыўны пачатак.

Неабходна адзначыць, што, нягледзячы на прысутнасць у вершах М. Багдановіча змрочнай афарбоўкі пры апісанні большасці міфалагічных істот, мы вымушаны прызнаць наяўнасць у іх светлага, аптымістычнага пачатку. „Вадзянікі, русалкі, змяіны цар у вершах М. Багдановіча не маюць той злавеснай моцы, той варожасці да чалавека, якія ўласцівы міфалагічным персанажам Янкі Купалы. Гэта заўсёды светлыя, лёгкія духі роднай зямлі, якія толькі ўпрыгожваюць яе і зусім, бадай, не намякаюць пра трагічны цяжкі шлях пераадолення цёмных сіл жыцця“ [4, с. 189]. Гэта адносіцца і да вершаў нашых сучаснікаў.

Асабліва паслядоўна прасочваецца творча-эстэтычная трансфармацыя міфалагічных матываў М. Багдановіча ў кнізе паэзіі А. Дэбіша „Стодзівы“. З вераю ў чыстых, сумленных людзей жыве герой А. Дэбіша. Ён перасцерагае, што ў чалавечых душах запануе жудасная пачвара Чарнабога, калі людзі канчаткова згубяць надзею, калі стануць бязвольнымі, бяспамятнымі: „Тады прыходзіць ён – / І ў сэрцы смутак сее, / І дух не выпускае мой з ярма“ (верш „Чарнабог“). Ён здольны ўчыніць здзек нават з самага светлага і чыстага – кахання, „святлом напоўніўшы чужым“. І тады няўтульна, адчужана адчувае сябе чалавек у людскім асяроддзі: „Збавення я прашу ды гэта – марна... / І прэч я ад людзей бягу тады“.

Нягледзячы на назву „Чарнабог“, верш успрымаецца намі даволі аптымістычна: святло заўсёды перамагае цемру. Няма на свеце такіх перашкод, якія б засланілі высокім людскім душам шляхі да багоў светлаясных. Лірычны герой А. Дэбіша імкнецца жыць па законах дабрыні і міласэрнасці. Для сучаснага паэта зварот да міфалогіі стаў той крыніцай, якая спаталяе вечную і непераможную чалавечую прагу літасці і справядлівасці, праўды і шчырасці, чысціні і хараства.

Тэму жыцця і смерці, якая хвалюе кожнага чалавека, паэт А. Дэбіш вырашае з гуманістычных пазіцый. Ён, як і нашы продкі, не жадае мірыцца са смерцю, спрабуе паглядзець на яе, як на нейкі неабходны момант у кругазвароце жыцця: нараджэнне – жыццё – смерць – нараджэнне. Як бачна, зварот да матываў міфалогіі дапамагае сучасным паэтам глыбока асэнсаваць шляхі пераадолення трагізму быцця. А. Дэбіш у вершы „Велямос“ нагадвае: перад смерцю ўсе роўныя. „А над усім, на троне – Велямос“. Бог смерці стаіць над кожным: „над людзьмі, людцамі, рабамі, вяльможамі“, таму пры жыцці людзі павінны абыходзіцца адзін з адным па законах чалавечнасці. Да такой маральнай высновы прыходзіць наш паэт-сучаснік.

Як і М. Багдановіч, які не прымаў жыцця-сну нямоглых русалак, вадзянікаў, бо для яго жыццё-існаванне было страшнейшым за смерць, лірычны герой зборніка „Стодзівы“ А. Дэбіша не жадае прыслухоўвацца да замоў Мары, якая „ашчэраным ротам нашэптвае словы аб вечнай самоце“. Жыццю-рабству А. Дэбіш супрацьпастаўляе самаахвярнае жыццё, калі нават гэта – жыццё-імгненне. Перад героем верша „Кава“ паўстае выбар: альбо смерць са славай, альбо „быць заўжды

папіхачом". У „безназоўны час" герой не спадзяецца на цуд. Здаецца, ён здольны ўжо прымірыцца са сваім лёсам. Але ў такія хвіліны да яго з'яўляецца бог Кава, які вызваляе яго рукі ад путаў, у душы сее зернейкі веры, надзяляе мужнасцю: „І сілу я адчуў, і рушыў / Туды, дзе жорсткі бой кіпеў... / І за сабою чуў я мужны, / Непераможны, зычны спеў!".

Жыццёвая пазіцыя лірычнага героя А. Дэбіша супадае з пазіцыяй самога аўтара зборніка „Стодзівы", для якога найгоршы здзек – жыць і памерці на каленях. Зусім відавочна, што міфалогія стала для А. Дэбіша тымрэальным зямным грунтам пад нагамі, які дапамог паэту ў момант самага высокага духоўнага напружання далучыцца да асэнсавання маральных праблем сучаснага грамадства, пераадолець крызіс ваганняў і няпэўнасці ў душы сучасніка, спыніць хваробу абыякавасці, пасіўнасці, што даволі хутка распаўсюджваецца ў грамадстве. Услед за М. Багдановічам, якому ўдалося стварыць „на аснове нацыянальнай міфалогіі велічны „міф" аб зачараваным царстве роднага духу і яго непазбежным абуджэнні" [7, с. 474], А. Дэбіш сваім паэтычным зборнікам „Стодзівы" пераконвае чытача ў тым, што зварот да міфалогіі будзе спрыяць ачышчэнню „ад хлуду" не толькі лясоў, але і ад бруду „змярцвелых чалавечых душ" (верш „Зніч").

Як бачна, сучасная паэзія, у тым ліку і берасцейская, не разбурае традыцый папярэднікаў, а дапаўняе і абнаўляе іх. Не паганскае светаадчуванне, не свет міфалагічных істот прываблівающь сучасных беларускіх паэтаў. Іх цікавіць шматаблічнасць жыцця і свету. Зварот да матываў міфалогіі, па нашым перакананні, – гэта моцны бок творчасці паэтаў, паказчык паглыблення інтэлектуальнасці і філасафізму ў сучаснай паэзіі, што, у сваю чаргу, з'яўляецца крыніцай абнаўлення літаратуры. „Па сутнасці міфы – гэта своеасаблівая філасофская паэзія" [9, с. 7]. Міфалагічныя матывы выкарыстоўваюцца паэтамі дзеля таго, каб прыцягнуць увагу чытача да надзённых агульначалавечых, нацыянальных, экалагічных праблем, знайсці ў цішы мінуўшчыны той пластычны матэрыял, з якога іншыя маглі б ляпіць сучасныя сацыяльныя формы.

**Літаратура**


1. Багдановіч М. Збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991–1995.
2. Грынчык М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі / М. Грынчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 296 с.
3. Дудзюк З. „Пераказаць жыццё не хопіць слоў..." (гутарка з пісьменніцаю) / З. Дудзюк // Вечерний Брест. − 1992. – 7 августа. – С. 5.
4. Каваленка В. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 319 с.
5. Калеснік У. Тварэнне легенды: літ. партрэты і нарысы / У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 431 с.
6. Лойка А. Максім Багдановіч / А. Лойка. – Мінск: Навука і тэхніка. – 1966. – 335 с.
7. Чабан Т. Космас „Вянка". Літаратурны каментарый да „Вянка" Максіма Багдановіча / Т. Чабан // Багдановіч М. Збор твораў: у3 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1. – С. 463–518.
8. Чабан Т. Сучасная паэзія і фальклор / Т. Чабан, Я. Гарадніцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 128 с.
9. Шамякіна Т. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 400с.



*У артыкуле закранаецца праблема звароту сучасных мастакоў слова да міфалагічных традыцый, прасочваецца іх пераемнасць. Сцвярджаецца думка, што паэзія, якая не пазбаўлена нацыянальнай самабытнасці і народнай эстэтыкі, з годнасцю папоўніць скарбніцу сусветнай культуры. Падчас праведзенага аналізу ёсць магчымасць пераканацца, што сучасных творцаў цікавіць не паганскае светаадчуванне, а шматаблічнасць жыцця і свету, адлюстраванне архетыпічных вобразаў у мастацтве.*



*Міфалагічныя матывы, сучасная паэзія, традыцыя, філасафізм, нацыянальная самабытнасць, эстэтычныя запатрабаванні, гармонія, архетып.*



*In the article there has been touched the problem of the appeal of modern artists of the word to the mythological traditions, their succession has been followed. The Thought is proved that the poetry which doesn't lack in national individuality and the folk aesthetic will contribute to treasures of the world culture/ After the analysis having done there is the possibility to make sure, that the modern artists aren't interested in pagan world outlook but in the diversity of life and the world, the illustration of archetype images in art.*



***Keywords**: mythological motives, modern poetry, tradition, philosophy, national individuality, aesthetic demands, harmony, archetype.*